

# Прытулак душы

**Прыкметная з'ява.** Паэтам можна і не быць, але быць грамадзянінам і адказным чалавекам трэба абавязкова. Літаратурны конкурс «Дэбют» падтрымлівае не толькі таленты

## Чаму ў дзяцей сумныя вочы?

«Дзякуй табе, Божанька, за тое, што ў мяне такія цудоўныя мама з татам», — кажу я кожны раз, кладучыся спаць. І ведаю, што сон мой будзе салодкі і спакойны, таму што побач мае бацькі — Васіль і Ганна. Бабуля кажа, што гэта самае прыгожае спалучэнне імён: Васіль і Ганна — героі рамана Івана Мележа «Людзі на балоце», і яны, па словах бабулі, вельмі прыгожыя людзі. Я яшчэ не чытала гэты твор. Але я і так упэўненая, што ў маіх бацькоў самае цудоўнае спалучэнне імён на свеце.

А яшчэ мне страшна падумаць, што я магла б нарадзіцца ў другой сям'і, дзе бацькі разыходзяцца, дзе дзеткі не атрымліваюць асаблівай бацькоўскай увагі, пяшчоты, клопату. Я, на жаль, ведаю такіх дзяцей: у іх сумныя вочы і сумная ўсмешка. Адчуваецца, што іх душа не знайшла ўтульнага прытулку ў сям'і. А без яго і цяжка, і сумна.

Калі я прытуляюся да сваёй матулі, то адчуваю, што мая душа прытуляецца да яе душы, таму нам так хораша разам. Мама заўсёды разумее, што мне патрэбна і чаго я хачу. Як яна аб гэтым даведваецца? Мабыць, у душы ёсць своеасаблівыя воблачкі, якія пераплываюць ад маці да дачкі і наадварот і перадаюць тое, што ляжыць на сэрцы. Бо як мама магла б здагадацца, што я хачу новую сукенку, каб выступіць на школьным канцэрце? Я толькі-толькі аб гэтым падумала, а матуля ўжо купіла тканіну, розныя ўпрыгожванні і пашыла мне менавіта такую сукенку, як я хацела.

Ці як магла мама даведацца, што мне падабаецца маляваць, і адвяла мяне ў гурток па маляванню? Купіла альбом, фарбы, пэндзлікі і мастацкія фламастэры. Цяпер мае малюнкі ўпрыгожваюць не толькі сцены нашай кватэры, але і бабулінай. Усе радуюцца кожнаму майму малюнку, і мне гэта падабаецца. Таму кожны раз стараюся маляваць яшчэ прыгажэй і цікавей. А без мамінай і татавай падтрымкі мне б, пэўна, гэтага не хацелася б зусім. Таму я абавязкова намалюю і сваіх бацькоў. У вобразе самых прыгожых кветак: маму Ганну — як анюціны вочкі, а тату Васіля — васільком, які з'яўляецца сімвалам нашай краіны і самай прыгожай з кветак.

Мне вельмі хочацца, каб ва ўсіх дзяцей таксама былі добрыя, клапатлівыя і ўважлівыя бацькі, каб іх душам было заўсёды ўтульна і цёпла.

***Людміла Поцес, вучаніца 3 «В» класа СШ № 203, 9 гадоў***

## Я хачу туды!

«Сумным восеньскім вечарам вярталася дамоў. Надвор'е, як і настрой, было не самае лепшае: па парасоне грукаталі частыя кроплі дажджу, павевы ветру вырывалі яго з рук, сцежка была засцелена апаўшым мокрым лісцем, змешаным з зямлёю, часам пад нагамі трапляліся раскіданыя пацеры каштанаў. Як добра, што ад будынка, дзе працую, да аўтобуснага прыпынку было зусім недалёка. А вось і аўтобус. Перада мною ўвайшлі дзве жанчыны прыкладна майго ўзросту, адразу селі, і якраз тварам да мяне. Не трэба было нават прыслухоўвацца, як былыя сяброўкі сталі абмяркоўваць нечаканую сустрэчу, дзівіцца выпадку.

— Ну, расказвай, як ты жывеш? — звярнулася адна да другой.

Тая, якой было адрасавана пытанне, адразу перамянілася ў твары. Радасці ад нечаканай сустрэчы з сяброўкай як і не было:

— Ат, жыву аднымі ўспамінамі.

І пачала распавядаць пра сябе...

Хутка я была дома. Не здымаючы паліто, моўчкі прысела на невысокі шкапік для абутку. І сярод цішыні пустой кватэры ўсё яшчэ чула голас той незнаёмай жанчыны: «Ат, жыву аднымі ўспамінамі». Да горла падкаціўся клубок. Гэтыя ж словы былі і пра мяне.




Узнагароду ўручае выдавец Анатоль Гармаза

**Сёлета былі прапанаваны на выбар тэмы «Сям'я — прытулак душы», «Мы гэтай зямлі працяг» і «Всё побеждает любовь, покоримся же и мы ее власти (Вергилий)».**
**Конкурс штогод нецярпліва чакаюць усе жыхары Першамайскага раёна, прычым самага рознага ўзросту і прафесійнай прыналежнасці, і старанна рыхтуюцца да яго.**

...Колькі помню сябе малой, школьніцай, дарослай жанчынай, наша сям'я часта наведвалася ў вёску. Адтуль родам былі мае бацькі, якія яшчэ ў юнацтве з'ехалі жыць і працаваць ў Мінск. Пэўна ж, не так лёгка было ім адарвацца ад сваіх каранёў, бо прыязджалі ў родную вёску амаль кожныя выходныя. Там жа збіраліся і астатнія члены вялікай сям'і. Дзед з бабуляй былі вельмі задаволеныя.

У драўлянай хаце і ва ўсім двары ў такія дні стаяў нябывалы гоман: дарослыя мужчыны нешта будавалі, рамантавалі, пілілі дровы, тапілі лазню, распавядалі пра ўдалае вуджэнне ці збор грыбоў. Жанчыны знаходзілі справы на агародзе, прыбіралі ў хаце, ладзілі сняданкі, абеды, вячэры. Дзеці, старэйшыя і малодшыя, любілі днямі сядзець на печы, знаходзячы там розныя забавы, ці бегалі па ваколіцы, гулялі ў хованкі, спрабавалі ўзлезці на вялізны камень, які быў вышынёю значна большы за кожнага з нас.

Кожны дзень такіх сустрэч абавязкова завяршаўся за доўгім вялікім сталом, уздоўж якога з двух бакоў стаялі драўляныя лавы. Ад прыемнага паху страў на стале аж зводзіла сківіцы. Я, адзіная дзяўчынка сярод унукаў, заўсёды старалася сесці паміж бабуляй і дзядулем. Менавіта седзячы побач з імі я заўсёды адчувала сябе надзейна абароненай ад усялякіх наступстваў, а яшчэ гэтыя іх бязмерныя любоў і цяпло. Рукі бабулі, якія абдымалі мяне за плечы, прыціскаючы бліжэй да сябе, пахлі сырадоем і былі шурпатымі ад бясконцай працы. Але ж мне яны здаваліся самымі мяккімі і ласкавымі. Дзед, які меў звычку пасмейвацца ў вусы, заўсёды хваляваўся, ці не галодная я, і падкладваў у маю талерку ўсё самае смачнае, што было на стале.

За тым вялікім сталом кожны, каму было што распавесці пра свае планы, праблемы, справы, думкі, знаходзіў і слухача, і падтрымку, і дапамогу. Здаралася, спрачаліся, часам нават сварыліся, але тут жа даравалі адно аднаму і наступны раз зноў апыналіся побач.

Усё далейшае жыццё нейкая магічная сіла цягнула мяне менавіта туды — у тую драўляную хату, за той доўгі стол, да ўсіх сваіх родных. Там было ўсё дзіўна проста, натуральна, па-сапраўднаму. Не трэба было імкнуцца некаму спадабацца, заўсёды можна было быць самою сабой. Не трэба было чорнае называць белым ці наадварот, бо кожны прымаў і паважаў твае погляды і меркаванні.

Як жа добра было і твайму целу, і тваёй душы... Утульна, спакойна. І як хацелася, каб гэта доўжылася вечна...

Я не была там больш за 30 гадоў, бо там ужо няма нікога з родных. Ды і ў хаце жывуць людзі, якіх я нават не ведаю. Кажуць, што там іншы дах, іншыя столь, падлога. І ганак, па якім я сыходзіла апошні раз, назаўсёды пакідаючы дарагую сэрцу хату, ужо не такі высокі. А яшчэ гавораць, што вялізны камень, на які я так і не залезла ні ў дзяцінстве, ні пазней, увесь увайшоў у зямлю. Я баюся гэта ўбачыць, баюся парушыць усё тое, што грэе сэрца і душу ўсе жыццё.

...Я зняла паліто і пайшла ў кухню, каб заварыць сабе гарбату. Села за стол, і позірк спыніўся на ручніку, што застаўся ад бабулі. Я ўзяла яго і прыціснула да твару. Ён пах малаком-сырадоем, як некалі бабуліны рукі. Ішоў час, а я ўсё не магла адарвацца. Моўчкі

глядзела на ручнік і думала: «Як жа я хачу туды!»

***Галіна Сярова, выхавальнік ясляў-сада № 210, 60 гадоў***

## Абуджаныя пачуцці

Аўтары гэтых эсэ розныя і па ўзросту, і па жыццёваму вопыту. Але ёсць тое, што іх яднае. Гэта неабыякавасць да таго, что адбываецца навокал, і цяга да творчасці. Менавіта такіх людзей аб'ядноўвае штогод літаратурны конкурс «Дэбют», які прайшоў у Першамайскім раёне ў дваццаты раз. Як паказалі вынікі, за гэты час ён не страціў сваёй папулярнасці.

На суд журы, якое ўсе гэтыя гады ўзначальвае паэт і пісьменнік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў галіне літаратуры і спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Раіса Баравікова, былі вынесены больш за 250 вершаў, апавяданняў і эсэ.

— Конкурс стаў прыкметнай з'явай у творчым жыцці як Першамайскага раёна, так і ўсёй сталіцы, — адзначыла старшыня журы. — І гэта найперш заслуга намесніка начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Першамайскага раёна, загадчыка сектара культуры Лілії Кавалёвай. Лілія Рыгораўна аддае гэтаму конкурсу, аналагаў якому ў нашай краіне бадай не засталося, не толькі шмат увагі і часу, але і часцінку свайго сэрца. «Дэбют», які за час свайго існавання стаў візітоўкай раёна, дазволіў выявіць і падтрымаць сотні талентаў. І ўжо толькі за гэта раённай адміністрацыі вялікае дзякуй! Удвая прыемна, што конкурс, як і раней, штогод нецярпліва чакаюць усе жыхары раёна, прычым самага рознага ўзросту і прафесійнай прыналежнасці, і старанна рыхтуюцца да яго. Тэмы кожны раз мяняюцца, аднак вось гэта жывая цікаўнасць застаецца нязменнай.

Сёлета былі прапанаваны на выбар тэмы «Сям'я — прытулак душы», «Мы гэтай зямлі працяг» і «Всё побеждает любовь, покоримся же и мы ее власти (Вергилий)».

— Вызначаючы тэмы для творчага спаборніцтва, мы штогод зыходзім з таго, каб даць нагоду і магчымасць жыхарам раёна задумацца і разважаць над вечнымі праблемамі нашага жыцця: аб адносінах да роднай зямлі, Радзімы, аб сваёй будучыні і будучыні сваіх дзяцей, аб такіх вечных паняццях, як сям'я і каханне, — растлумачыла Лілія Кавалёва. — Не ўсе канкурсанты стануць літаратарамі, а вось абуджаныя конкурсам пачуцці — мы, арганізатары конкурсу, вельмі спадзяемся на гэта — будуць заўсёды весці іх па жыцці.

Журы вызначыла пераможцаў па кожнай з трох тэм у пяці ўзроставых катэгорыях, прычым асобна ў паэзіі, прозе і публіцыстыцы. Такім чынам, пераможцамі і прызёрамі сталі 76 чалавек. Самаму малодшаму 7 гадоў, а самаму сталаму — амаль 80. Сярод лаўрэатаў школьнікі, студэнты, кадэты, педагогі, служачыя, пенсіянеры.

Узнагароджанне аўтараў лепшых работ адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы, якая традыцыйна выступае суарганізатарам конкурсу. Акрамя дыпломаў і памятных прызоў усе пераможцы атрымалі падарункі.

**Уладзімір НІКАЛАЙЧУК**

**Фота Міколы ЛІННІКА**